Чараўко В. У.

# Раскопкі Міхаіла Кусцінскага ў Лепельскім павеце і познесярэдневяковыя курганныя пахаванні беларускага падзвіння

Курганы на беларускіх землях былі дамінуючай формай надмагільнага збудавання ў канцы VIII–X ст. Пасля прыняцця хрысціянства яны пачалі выцясняцца грунтовымі магіламі. З XII ст. звычай насыпаць над пахаваннямі курганы паступова знікаў. У XIII ст. курганныя пахаванні саступілі месца бескурганным. У ваколіцах Полацка гэты працэс адбыўся яшчэ раней — у XII ст. [1; 491–492, 2; 178, 3; 58]. На тэрыторыі Усходняй Еўропы курганны абрад у познім сярэдневякоўі існаваў на наўгародскіх землях, у водзі, вяцічаў. Непрацяглы час пасля царкоўнага расколу XVII ст. у Расіі ён практыкаваўся стараверамі [6; 77].

У археалагічнай літаратуры маюцца звесткі аб познесярэдневяковых курганных пахаваннях на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Да гэтага пытання спецыяльна звярталася Л. У. Дучыц [5, 6, 8; 124–125]. Яна абагульніла наяўную інфармацыю, суаднесла археалагічны матэрыял з дадзенымі этнаграфічных назіранняў, звярнула ўвагу на ролю кургаоў у памінальным абрадзе ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі [5, 6, 8; 124–125]. Даследчыца прыйшла да высновы, што адны познесярэдневяковыя курганы на Беларусі з'яўляюцца рэліктамі дахрысціянскіх вераванняў, а другія — сведчаннем адраджэння язычніцкіх традыцый у перыяд Рэфармацыі і контррэфармацыі [5; 82, 6; 78, 8; 124].

Паводле падлікаў Л. У. Дучыц, у літаратуры сустракаюцца звесткі не менш як аб пяці познесярэдневяковых курганных пахаваннях, выяўленых на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Тры з іх вузка датуюцца па нумізматычных знаходках. М. Ф. Кусцінскі каля маёнтка Забалоцце на Лепельшчыне даследаваў курган з пахаваннем, у якім была манета 1562 г. Курганнае пахаванне з манетай 1569 г., выяўленае каля в. Крывец на Лепельшчыне, згадвае А. М. Семянтоўскі. Каля в. Кузьмаўшчына на Браслаўшчыне ў кургане была знойдзена манета 1566 г. [8; 125]. Акрамя таго, да познесярэдневяковых адносяцца датаваныя па фрагментах керамікі курганы каля в. Нарушова Глыбоцкага раёна (даследаванні А. і У. Галубовічаў) і каля в. Горы Чашніцкага раёна (раскопкі Э. М. Зайкоўскага) [6; 77–78, 8; 124–125].

Невялікая колькасць курганных пахаванняў, вызначаных як познесярэдневяковыя, вымушае ўважліва вывучыць звесткі аб іх. Два з трох выпадкаў выяўлення манет XVI ст. у курганных пахаваннях звязаны з даследаваннямі М. Ф. Кусцінскага. Мы ведаем аб іх з кнігі А. М. Семянтоўскага «Беларускія старажытнасці» і артыкула М. Ф. Кусцінскага «З нататак аб курганах Лепельскага павета» [17, 12]. Параўнаем звесткі аб гэтых раскопках.

А. М. Семянтоўскі паведамляе аб раскопках М. Ф. Кусцінскага, спасылаючыся на яго ліст ад 16 сакавіка 1885 г. Нягледзячы на адсутнасць двукосся, тэкст падаецца ад першай асобы («я выявіў», «я знайшоў») [17, с. 27–28]. Гэта ўказвае на тое, што ліст не пераказваецца, а цытуецца дакладна і літаральна. Паводле гэтага паведамлення, у Пышнянскай воласці на адлегласці прыкладна ў 15 вёрст ад Лепеля, каля вёскі і возера Крывец, М. Ф. Кусцінскі выявіў 12 курганоў побач са старымі закінутымі хрысціянскімі могілкамі. Крыжы на хрысціянскіх могілках не захаваліся, невялікія магільныя насыпы былі абкладзены камянямі. Раскопкі двух бліжэйшых да старых могілак курганоў выявілі ў адным жаночы шкілет з сярэбраным патрыгрошным грошам Жыгімонта Аўгуста 1569 г. на лобнай костцы. На касцяку захаваўся скураны пояс, упрыгожаны шпількамі («булавками»), «гэткімі ж, як і ця-

перашнія». У другім кургане быў знойдзены жалезны трохгранны напільнік і кавалкі крэменя [17; 27–28].

Аб другім выпадку знаходжання манеты ў познесярэднявечным курганным пахаванні піша сам М. Ф. Кусцінскі. У адпаведнасці з яго паведамленнем, у 1879 г. археолаг праводзіў раскопкі курганоў над возерам Доўгае, на зямлі, якая адносілася да маёнтка Забалоцце Пышнянскай воласці. Курганоў было каля 10. Яны размяшчаліся ў адну лінію. Апошні курган прымыкаў да старых хрысціянскіх могілак, на якіх даўно не хавалі. Усе крыжы згнілі. Былі заўважаны невялікія малыя насыпы, абкладзеныя невялікімі камянямі. У ходзе раскопак двух бліжэйшых да могілак курганоў у адным быў знойдзены жаночы, у другім — мужчынскі касцякі. На жанчыне быў скураны пояс, упрыгожаны прыблізна сарака меднымі шпількамі («булавками») з галоўкамі «накшталт сучасных». Каля мужчынскага шкілета ляжалі кавалкі крэменя і стальны трохгранны напільнік, відаць, крэсіва. На лобнай костцы чэрапа ляжала сярэбраная манета — паўгрош Жыгімонта Аўгуста 1562 г. [12; 235].

Апісанні гэтых курганных пахаванняў вельмі падобныя [18; 272–273]. Адрозніваюцца намінал і дата манеты, яе прыналежнасць да жаночага або мужчынскага пахавання, назва возера, каля якога праводзіліся раскопкі. Супадаюць даследчык, мясцовасць, від пахавальнага збудавання, асаблівасці курганнага магільніка і яго размяшчэння, колькасць даследаваных курганоў, пол пахаваных, факт наяўнасці манеты менавіта на лобнай костцы, іншыя знаходкі. У абодвух выпадках курганны абрад пахавання звязваецца з перажыткамі паганства. У абодвух выпадках апісваюцца толькі адны раскопкі без згадкі на другія. Прымаючы пад увагу, што М. Ф. Кусцінскі першым на тэрыторыі Беларускага Падзвіння адкрыў два курганных пахаванні з манетамі XVI ст., цяжка ўявіць, што пры паведамленні аб другім падобным адкрыцці даследчык не ўзгадаў аб першым.

Зыходзячы з карты Генеральнага штаба СССР 1936 г. маштаба 1:50000, вёска Забалоцце знаходзіцца непадалёк ад вёскі Крыўцы (Крывец?), якая размешчана на беразе возера Доўгае. Параўнан-

не паведамленняў А. М. Семянтоўскага і М. Ф. Кусцінскага аб раскопках апошнім курганоў XVI ст. у Лепельскім павеце ўказвае на тое, што ў двух выпадках апісваюцца адны і тыя ж раскопкі [19; 162].

У публікацыі М. Ф. Кусцінскага жаночае пахаванне датавана перыядам, не ранейшым за XV–XVI стст. на падставе нейкіх медных шпілек («булавок») на поясе [12; 235]. Апісваючы гэтыя раскопкі, у артыкуле 1989 г. Л. У. Дучыц следам за М. Ф. Кусцінскім назвала абодва пахаванні прыкладамі познесярэдневяковых курганоў [5; 77]. У больш позніх публікацыях даследчыца аднесла да познесярэдневяковых толькі пахаванне з манетай [6; 77, 8; 125]. Другі, крытычны падыход падаецца слушным, паколькі невядома дакладна, што ўяўлялі згаданыя артэфакты, на падставе якіх вызначаны перыяд XV–XVI стст. Да таго ж маюцца разыходжанні ў апісаннях раскопак М. Ф. Кусцінскім і А. М. Семянтоўскім (паводле А. М. Семянтоўскага, манета знаходзілася менавіта ў жаночым пахаванні) [17; 27–28].

У публікацыях М. Ф. Кусцінскага і А. М. Семянтоўскага няма непасрэднага ўказання, дзе канкрэтна ў кургане знаходзілася пахаванне з манетай. Але ў абодвух аўтараў згаданае пахаванне разглядаецца як сведчанне ўстойлівасці паганскай традыцыі, згодна з якой нябожчыка не закапвалі ў магіле, але размяшчалі на паверхні зямлі і зверху насыпалі курган [12; 235, 17; 28]. Адпаведна, пахаванне з манетай знаходзілася на гарызонце.

Звесткі аб курганным пахаванні з манетай 1566 г. каля в. Кузьмаўшчына на Браслаўшчыне вельмі сціслыя [8; 125]. Яны не датычацца таго, якім чынам даследавалася гэта пахаванне. Інфармацыя аб манеце ўтрымліваецца ў «Інвентарнай кнізе Музею імя І. Луцкевіча Беларускага навуковага таварыства ў Вільні», апублікаванай у 1995 г. [11]. У раздзеле «К. Перыяд дагістарычны (камень — бронза — жалеза — урны)» у падраздзеле «Рознае» пад нумарамі 206–212 згаданы прадметы, якія знойдзены «ў магіле апроч касцяку» «на хутары «Бароўка» Баляслава і Генрыха Пецюкевічаў, Ёдскай воласці Браслаўскага павету» [11; 110]. Сярод прадметаў пералічаны «3 скалкі-крэмені», крэсіва, жалезны нож,

жалезная спражка, 2 фрагменты керамікі, бронзавы крыжык і манета 1566 г. [11; 110–111].

У «Інвентарнай кнізе» выяўленыя ў курганах артэфакты маюць адпаведныя пазнакі: «пры раскопцы курганоў» або «з курганоў» [11; 107, 109–110]. Але рэчы пад нумарамі 206–212 пазначаны як знойдзеныя «ў магіле». Гэта не выключае іх выяўлення ў курганным пахаванні. Аднак прамое ўказанне на курган як месца выяўлення манеты адсутнічае. Калі лічыць пахаванне курганным, то невядома, дзе яно знаходзілася: у насыпе, на гарызонце, у падкурганнай яме. У дадзеным выпадку гэта прынцыпова, бо размова можа ісці і пра пахаванне, упускное ў курган больш ранняга перыяду.

Адсутнасць прамога ўказання на курган разам з недахопам інфармацыі аб даследаванні пахавання дае падставу крытычна паставіцца да вызначэння згаданай магілы як познесярэдневяковага курганнага пахавання з манетай.

Курган каля в. Нарушова Глыбоцкага раёна быў раскапаны ў 1938 г. [4; 126, 20; 44]. Інфармацыя аб ім прысутнічае ў публікацыях А. і У. Галубовічаў [4; 126, 21; 5]. Курган знаходзіўся ў складзе курганнай групы. У ім былі выяўлены 3 пахаванні XIII–XIV стст., якія размяшчаліся ў верхняй частцы насыпу [4; 128, 21; 5]. Шырокі перыяд датавання (XIII–XIV ст.) дае падставу паставіць пад пытанне вызначэнне згаданых курганных пахаванняў як познесярэдневяковых.

Курган каля в. Горы Чашніцкага раёна быў вывучаны Э. М. Зайкоўскім у 1981 г. [10; 347–348]. У ім выяўлена некалькі вугалькоў на ўзроўні старажытнага гарызонта. У насыпе кургана былі знойдзены фрагменты познесярэдневяковага керамічнага начыння [5; 77, 10; 348]. Паколькі сляды пахавання ў кургане адсутнічаюць, ён не адносіцца да ліку ўласна пахавальных помнікаў.

Курган каля в. Горы Чашніцкага раёна можа разглядацца як рытуальны аб'ект, які выкарыстоўваўся ў памінальных абрадах [5; 78–81, 8; 125]. Выкарыстанне курганоў у памінальнай абраднасці прасочваецца не толькі ў познім сярэдневякоўі, але лакальна адзначана нават у канцы XX ст. У прыватнасці, у в. Жарнасе-

кава Бешанковіцкага раёна У. А. Лобачам у 1996 г. зафіксавана традыцыя спраўляць памінкі на размешчаных на могілках курганах [9; 226, 16; 45]. Рытуальныя курганы вядомы і ў сумежных з Беларускім Падзвіннем рэгіёнах [13; 75]. Рытуальныя насыпы і сувязь курганоў з познесярэдневяковай памінальнай абраднасцю патрабуюць асобнага вывучэння і ў дысертацыі не разглядаюцца.

У выніку крытычнага аналізу звестак аб познесярэдневяковых курганах можна дакладна казаць аб выяўленні на тэрыторыі Беларускага Падзвіння толькі аднаго такога помніка — пахавання каля в. Забалоцце Лепельскага раёна. Гэта суадносіцца з дадзенымі па беларускіх землях у цэлым. Нешматлікія познесярэдневяковыя курганы адзначаны на сумежных з Беларускім Падзвіннем тэрыторыях: у Цэнтральнай Беларусі і ў Падняпроўі [8; 124–125]. Напрыклад, каля в. Крапіўна Аршанскага раёна В. М. Ляўко былі ўскрыты 3 курганы, якія знаходзіліся ў складзе курганнай групы з 22 насыпаў. Курган № 1 утрымліваў мужчынскае пахаванне ў падкурганнай яме. Каля падэшвы кургана побач з пахавальнай ямай была зафіксавана зольна-вугальная пляма (сляды рытуальнага вогнішча). Пахаванне перакрывала магутная зольна-вугальная праслойка таўшчынёй 0,9 м. Вышэй за яе на глыбіні 0,1 м ад вяршыні насыпу выяўлены рэшткі абгарэлых бярвенняў дыяметрам 5–6 см, якія ўтваралі насціл. На ім знаходзіліся абгарэлыя косці жывёл і фрагменты гаршка XVI–XVII стст. — рэшткі трызны [7; 136, 13; 75, 15; 119–120].

Курган № 3 утрымліваў мужчынскае пахаванне ў яме, перакрытае пяшчана-зольнай праслойкай, магутнасць якой каля краёў складала 0,1 м, а ў цэнтры дасягала 0,6 м. У ёй на розных узроўнях знаходзіліся фрагменты керамікі XIV–XV стст. [13; 75, 14; 31, 15; 119–120]. Курган № 2 утрымліваў парнае пахаванне жанчыны і дзіцяці, змешчанае ў яме. Каля галавы жанчыны знойдзены развал гаршка (31 фрагмент) і крамянёвы наканечнік дроціка (абярэг). Кераміка датуецца XII–XIII стст., але выяўляе падабенства з посудам XV ст. Слядоў рытуальных кастрышч у кургане № 2 не зафіксавана [7; 136–137, 13; 75, 15; 120].

Выяўлены на могільніку керамічны матэрыял сведчыць аб яго выкарыстанні ў XII–XV, а магчыма, і ў XVI ст. [7; 137, 15; 120]. Гэта не выходзіць за верхнюю мяжу дацiроўкі пахавання каля в. Забалоцце і пазначаных помнікаў, прыналежнасць якіх да познесярэдневяковых курганоў Беларускага Падзвіння знаходзіцца пад пытаннем.

Такім чынам, крытычны разгляд паведамленняў аб познесярэдневяковых курганах Беларускага Падзвіння дазваляе ўпэўнена казаць толькі аб адным такім помніку — кургане з манетай другой паловы XVI ст. каля в. Забалоцце Лепельскага раёна. Звяртае ўвагу тое, што ў ходзе маштабных даследаванняў найноўшага часу на Беларускім Падзвінні курганных пахаванняў XIV–XVIII стст. выяўлена не было. Адзінкавасць курганнага пахавання XVI ст. каля в. Забалоцце не дазваляе абгрунтавана вылучыць познесярэдневяковыя курганы ў асобную катэгорыю сельскіх пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. Пры гэтым выпадкі выяўлення познесярэдневяковых курганоў на беларускіх землях увогуле маюць адзінкавы характар. Паказальна, што дацiроўка кургана каля в. Забалоцце і храналогія помнікаў, прыналежнасць якіх да познесярэдневяковых курганных пахаванняў пастаўлена пад пытанне, не выходзіць за межы другой паловы XVI ст.

## Крыніцы і літаратура

1. Багамольнікаў, У. Пахавальны абрад / У. Багамольнікаў, Я. Рыер // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. М — Пуд / рэдкал. : г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1999. — С. 450–451.
2. Вайцяховіч, А. В. Пахавальны абрад / А. В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. — Мінск : БелЭн, 2009–2011. — Т. 2. Л – Я. — 2011. — С. 177–178.
3. Войтехович, А. В. Курганные захоронения Полоцкой округи IX–XI вв. / А. В. Войтехович // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневеко-

вом Полоцке / О. Н. Левко [и др.]; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. — Минск : Беларуская навука, 2012. — С. 54–58.

4. Голубович, Е. Славянские поселения правобережной Дисны в Вилейском округе БССР / Е. Голубович, В. Голубович // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях института истории материальной культуры. — М. — Л., 1945. — Вып. XI. — С. 126–137.

5. Дучыц, Л. У. Да пытання аб познесярэдневяковых курганах Паўночнай Беларусі / Л. У. Дучыц // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1989. — № 4. — С. 77–83.

6. Дучыц, Л. Познесярэдневяковыя курганы Беларусі / Л. Дучыц // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мінск, 1997. — № 12. — С. 77–79.

7. Дучыц, Л. У. Археалагічнае вывучэнне гарадскіх і вясковых могільнікаў / Л. У. Дучыц, А. В. Іоў, В. М. Ляўко // Археалогія Беларусі. У 4 т. — Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. — Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. — 2001. — С. 132–139.

8. Дучыц, Л. У. Вясковыя могільнікі. Агульная характарыстыка. Тыпалогія пахаванняў / Л. У. Дучыц // Археалогія Беларусі. У 4 т. — Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. — Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. — 2001. — С. 124–129.

9. Дучыц, Л. У. Сакральная геаграфія Беларусі / Л. У. Дучыц, І. Я. Клімковіч. — Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. — 384 с. ; іл.

10. Зайковский, Э. М. Исследование памятников неолита и бронзы Северной Белоруссии / Э. М. Зайковский // Археологические открытия 1981 года. — М. : Наука, 1983. — С. 347–348.

11. Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага навуковага таварыства ў Вільні // Спадчына. — 1995. — № 2. — С. 85–111.

12. Кусцинский, М. Ф. Из заметок о курганах Лепельского уезда / М. Ф. Кусцинский // Полоцкие епархиальные ведомости. — 1903. — № 7. — С. 232–235.

13. Левко, О. Средневековые погребальные памятники Оршанского Поднепровья / О. Левко // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў. Тэзісы дакладаў міжнароднай канферэнцыі, Мінск, 27–30 кастрычніка 1993 г. — Мінск, 1993. — С. 73–75.

14. Левко, О. Н. Отчёт об археологических исследованиях 1990 г. на территории северо-восточной Белоруссии / О. Н. Левко, Ю. В. Колосовский / Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Справа № 1204.
15. Левко, О. Н. Языческие реликты погребальных памятников XII–XVII вв. Оршанского Поднепровья / О. Н. Левко // Доклады Национальной академии наук Беларуси. — 2013. — Т. 57, № 3. — С. 116–123.
16. Лобач, У. Да вынікаў археалагічна-этнаграфічнай экспедыцыі ў мястэчку Бачэйкава і яго ваколіцах / У. Лобач // Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. — Полацк, 1996. — С. 45–48.
17. Сементовский, А. М. Белорусские древности. Вып. 1 / А. М. Сементовский. — СПб. : Типо-литография Н. Степанова, 1890. — 136 с. ; ил.
18. Чараўко, В. У. Вывучэнне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у дарэвалюцыйны перыяд / В. У. Чараўко // Гістарычна-археалагічны зборнік. — 2010. — Вып. 25. — С. 271–275.
19. Чараўко, В. У. Да пытання аб раскопках М. Ф. Кусцінскім познесярэдневяковых курганных пахаванняў у Лепельскім павеце / В. У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — 2011. — Вып. 21. — С. 160–162.
20. Штыхов, г. В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма. Вып. 2 / г. В. Штыхов. — Минск : Полымя, 1971. — 276 с.
21. Hołubowicz, H. Wykopaliska na Wileńszczyznie w latach 1938 i 1939 / H. Hołubowicz, W. Hołubowicz. — Wilno : Znicz, 1940. — 10 s.

Установа культуры “Лепельскі раённы краязнаўчы музей”

# VIII

# ЛЕПЕЛЬСКІЯ ЧЫТАННІ

Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі
Лепель, 19 кастрычніка 2018 г.

Мінск
«ІВЦ Мінфіна»
2019

УДК 908(476.5)(082)
ББК 26.89(4Беи)я43
В78

Выдаецца па рашэнні навукова-метадычнага савета
ўстановы культуры "Лепельскі раённы краязнаўчы музей"
ад 28 снежня 2018 г.

Р э ц э н з е н т ы:
прафесар кафедры гісторыі і турызму УА "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт", доктар гістарычных навук, дацэнт *У. А. Лобач*;
загадчык кафедры гісторыі Беларусі УА "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А. М. Дулаў*.

*Кніга выдадзена пры фінансавай падтрымцы ТАА "ЛОДЭ"*

В78 **VIII Лепельскія** чытанні : матэрыялы навук-практ. канф. (Лепель, 19 кастрычніка 2018 г.) / пад рэд. Я. А. Грэбеня. — ІВЦ Мінфіна, 2019. — 264 с.

ISBN 978-985-7205-95-0.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы ўдзельнікаў VIII навукова-практычнай канферэнцыі "Лепельскія чытанні", прысвечаныя пытанням гісторыі і культуры Лепельшчыны. Зборнік разлічаны на гісторыкаў, краязнаўцаў, а таксама на шырокае кола чытачоў.

**УДК 908(476.5)(082)**
**ББК 26.89(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-7205-95-0**

© УК "Лепельскі раённы краязнаучы музей", 2019
© Афармленне.
УП "ІВЦ Мінфіна", 2019

# ЗМЕСТ

**Чарняўскі М. М., Гаршкоў А. Д.** Даследаванне паселішча неаліту — жалезнага веку Прыгожая Верацея (Бярэшча 4) у 2018 годзе......3

**Клімаў М. В.** Асаблівасці працэса рассялення ў мікрарэгіёне азёраў Бабча і Кабак......10

**Бубенько Т. С.** Итоги исследований городища в д. Камень Лепельского района......22

**Тарасевіч В. М.** Папярэднія крытэрыі вылучэння жаночых пахаванняў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў......34

**Чараўко В. У.** Раскопкі Міхаіла Кусцінскага ў Лепельскім павеце і познесярэдневяковыя курганныя пахаванні Беларускага Падзвіння......38

**Леоненко С. Н**. Судьба обнаруженного в 1868 году М.Ф. Кусцинским каменного креста с надписью......46

**Валодзіна Т. В**. Тлумачэнне сноў у традыцыйнай культуры Лепельшчыны......51

**Аўсейчык У. Я**. Этнічныя групы Лепельшчыны ва ўяўленнях беларускага насельніцтва (па матэрыялах сучасных палявых этнаграфічных экспедыцый)......58

**Мишин П. И**. Представление о месте хтонических существ в традиционной картине мира белорусов (по фольклорно-этнографическим материалам Лепельщины)......65

**Мішына В. І**. Каравайная традыцыя і каравайныя песні Лепельшчыны......72

**Мізярска Н. А.** Сады і паркі шляхецкіх маёнткаў Лепельскага павета ў XVIII — пачатку XIX стст......78

**Анішчанка Я. К**. Лепельскі павет на планах 1811 і 1816 гг. ......84

**Тухта В. У**. Палякі на Лепельшчыне: ад хутароў да сталінскіх рэпрэсій ......117

**Меньченя С. В**. Погромы «винных» лавок на Лепельщине в июле 1914 г. ......128

**Яковлева г. Н**. Школа и сельское учительство Лепельщины в начале новой экономической политики ......132

**Сумко Е. В**. Дела Особой сессии народного суда при бюро юстиции Лепельского уездного совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (1920–1923 гг.)......150

**Бондарева Е. М**. О деятельности Лепельской районной контрольной комиссии Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии – рабоче-крестьянской инспекции Белорусской Советской Социалистической Республики (Лепельской РКК КП(б)Б – РКИ БССР) (сентябрь 1930 г. – февраль 1934 г.) ..... 156

**Астаповіч А. У**. Архітэктура і транспартная інфраструктура Лепельшчыны ў архіўных дакументах ..... 165

**Буевич Т. В**. Лепель от средних веков и до первой четверти XX века: историческое эссе для «Справочника Витебской губернии» (1921 года) ..... 173

**Стельмах А. В**, **Яковлева Г. Н**. К истории Лепельского пехотного училища ..... 182

**Копыл С. П.** Удар 1-го гвардейского авиационного смоленского корпуса дальнего действия по ж.д. узлу Полоцк в ночь с 24.06 на 25.06.1944 г ..... 222

**Бяспанскі С. І**. Гвардыі лейтэнант Іван Смажэўскі ..... 233

**Гребень Е. А**. Историография и источники по истории Лепельщины периода Великой Отечественной войны ..... 237

**Корсак А. И.** Воинские захоронения на территории Лепельского района: вопросы идентификации и мемориализации ..... 244

**Воднева И. П.** Работа по реализации социальных функций краеведческого музея Полоцка (на примере выставки «Почетные граждане города Полоцка») ..... 254

Звесткі пра аўтараў ..... 260